№2
26.03.03

**Конституционный Суд Республики Беларусь**

ул. К. Маркса, 32
220016, г. Минск
тел. (017) 227-52-09,
факс (017) 227-80-12
E-mail: ksrb@user.unibel.by

**Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь**

вул. К. Маркса, 32
220016, г. Мінск
тэл. (017) 227-52-09,
факс (017) 227-80-12
E-mail: ksrb@user.unibel.by

26.03.03 № 05-08/14-135

на № _________ от _______________

**Старшыні**
**Рады грамадскага аб'яднання**
**"Праваабарончы цэнтр "Вясна"**

**Бяляцкаму А.В.**

Паважаны Алесь Віктаравіч!

Ваш зварот адносна пенсіённага забеспячэння былых бортправадніц у Канстытуцыйным Судзе разгледжаны.

У сувязі з увядзеннем у дзеянне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 студзеня 1993 г. Закона Рэспублікі Беларусь "Аб пенсіённым забеспячэнні" былі ўстаноўлены розныя ўмовы назначэння пенсій асобным катэгорыям лётных работнікаў авіяцыі і лётна-выпрабавальнага складу. Пры гэтым для работнікаў лётнага і лётна-выпрабавальнага складу права на пенсію за выслугу гадоў было ўстаноўлена пры наяўнасці выслугі гадоў не менш 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын незалежна ад узросту. Што датычыцца бортправаднікоў, то яны права на пенсію за выслугу гадоў атрымалі: мужчыны – па дасягненні 55 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 25 гадоў, з іх не менш 15 гадоў бортправадніком; жанчыны – па дасягненні 45 гадоў і пры агульным стажы работы не менш 20 гадоў, з іх не менш 10 гадоў бортправадніцай.

Парадак вылічэння выслугі гадоў для работнікаў лётнага складу і бортправаднікоў таксама быў устаноўлены розны. Так, артыкулам 47 Закона "Аб пенсіённым забеспячэнні" было прадугледжана, што пералік пасад работнікаў лётнага складу, парадак вылічэння тэрмінаў выслугі гадоў для назначэння ім пенсій, а таксама парадак назначэння і выплаты пенсій работнікам лётна-выпрабавальнага складу зацвярджаецца ў парадку, які вызначаецца Саветам Міністраў.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 1992 г. № 758 "Аб умовах назначэння пенсій асобным катэгорыям работнікаў авіяцыі лётна-выпрабавальнага складу" былі ўстаноўлены асаблівасці вылічэння пенсій для работнікаў лётнага і лётна-выпрабавальнага складу. У Пералік пасад работнікаў лётнага складу, работа

З. 2185

bortpr-b.doc 26.03.03 ov1

ў якіх дае права на пенсію за выслугу гадоў (незалежна ад ведамаснай падпарадкаванасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый) былі ўключаны члены экіпажаў паветраных суднаў і іншых лятальных апаратаў (пункт 1), што ў далейшым і выклікала неадназначнае разуменне і прымяненне гэтага пункта на практыцы (хаця назва дадзенага Пераліку звязана з лётным складам).

Раней дзеючы Паветраны кодэкс СССР таксама адносіў бортправаднікоў да членаў экіпажа паветранага судна. Нягледзячы на гэта, заканадаўствам СССР і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для бортправаднікоў былі ўстаноўлены іншыя ўмовы назначэння пенсій, чым іншым членам экіпажа. Указанае адрозненне засноўвалася на тым, што згодна з артыкулам 18 Паветранага кодэкса экіпаж паветранага судна складаўся з камандзіра, іншых асоб лётна-пад'ёмнага складу і абслугоўваючага персаналу (да апошняга адносіліся і бортправаднікі). У сувязі з гэтым пенсіі лётнаму складу (камандзір і асобы лётна-пад'ёмнага складу) экіпажа паветранага судна раней устанаўліваліся ў больш высокіх размерах, чым бортправаднікам, а вылічэнне тэрмінаў выслугі гадоў для назначэння пенсіі лётнаму складу ажыццяўлялася ў больш ільготным парадку. Больш ільготны парадак назначэння і выплаты пенсій, як ужо адзначалася, быў устаноўлены і Законам Рэспублікі Беларусь "Аб пенсіённым забеспячэнні", які прадугледзеў розныя ўмовы назначэння пенсій для лётнага і лётна-выпрабавальнага складу і для бортправаднікоў.

Згодна з часткай другой артыкула 40 Паветранага кодэкса Рэспублікі Беларусь 1999 года экіпаж паветранага судна ўключае лётны экіпаж (камандзір і іншыя асобы лётнага складу) і кабінны экіпаж (бортаператары і бортправаднікі). Такім чынам, новы Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь таксама размежаваў экіпаж паветранага судна на дзве катэгорыі (лётны экіпаж і кабінны экіпаж), прычым умовы назначэння пенсій засталіся для лётнага складу і бортправаднікоў ранейшымі на падставе артыкула 47 Закона "Аб пенсіённым забеспячэнні".

Не закранаючы пытанне аб ацэнцы выконваемых лётным і кабінным экіпажамі функцый (складанасць, напружанасць і інш.), лічым магчымым разгледзець пытанне аб канстытуцыйнасці пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 18 снежня 1992 г. № 758 і адпаведных норм Закона "Аб пенсіённым забеспячэнні" пры наяўнасці прапановы ад суб'ектаў, якія валодаюць у адпаведнасці з артыкулам 116 Канстытуцыі правам на зварот у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь.

З павагай

**Намеснік Старшыні** **А.У. Марыскін**

bortpr-b.doc 26.03.03 ov1